*С. М. Ганчар*
(Мінск)

## Праблемы і перспектывы развіцця рэгіянальных музеяў

З развіццём і станаўленнем дзяржаўнасці ў нашай краіне пашыраецца працэс нацыянальна-культурнага развіцця і асэнсавання каштоўнага духоўнага патэнцыялу папярэдніх пакаленняў. У гэтым рэчышчы ўсё большую значнасць набывае дзейнасць рэгіянальных музеяў, якія захоўваюць і акамулююць для нашчадкаў унікальныя помнікі гісторыі і культуры, імкнучыся сваёй працай прадэманстраваць каштоўнасць нацыянальнай культуры і самабытнасць беларускага народа.

Адной з важных задач музеяў на сучасным этапе застаецца фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, захаванне гістарычнай памяці, што павышае ролю музеяў, а само музеязнаўства пазіцыянуе як значную складаючую развіцця навукі і культуры.

З цягам часу пры інтэнсіўным развіцці грамадства і імкліва рухаючыхся культурна-гістарычных працэсах у традыцыйныя ўяўленні аб музеях уносяцца карэктывы, часам процілеглыя традыцыйным поглядам. У аснову сучаснага разумення музея ў апошнія гады ўкладваецца новае бачанне сацыяльнага і культурнага кантэксту яго функцыянавання. Перабудоўваюцца адносіны паміж музейнымі ўстановамі і грамадствам: на змену пасіўнага адлюстравання рэчаіснасці прыходзіць актыўны ўплыў на яе. Адбываецца новае, якаснае перайначванне экспазіцыйнай працы пры пашырэнні сферы музейнай дзейнасці, распрацоўваюцца інавацыйныя праграмы культурна-адукацыйнай дзейнасці, удасканальваецца экспазіцыйны дызайн. Ідзе важкая трансфармацыя ў музейнай сферы, што перш за ўсё пераасэнсоўвае ролю музеяў у сучасным грамадстве, удасканальвае формы і метады работы музеяў з наведвальнікамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Аднак пры такім інтэнсіўным развіцці варта адзначыць нізкі ўзровень менеджменту ў сферы аховы і захавання культурных аб’ектаў, у прасоўванні культурна-рэкрэацыйнага брэнда нацыянальнай спадчыны. На недастатковым узроўні знаходзяцца таксама ўкараненне і засваенне ў дзейнасць музейных установ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новых інфармацыйных, мультымедыйных і інтэрнэт-тэхналогій, адзначаецца слабая камп'ютарызацыя і аўтаматызацыя ўліку музейных экспанатаў, алічбоўка найбольш каштоўных помнікаў культуры і мастацтва. Значную ўвагу неабходна надаць феномену інтэрактыўнасці ў музеях, які грунтуецца на выкарыстанні музейнымі ўстановамі камп'ютарных тэхналогій у сферы дызайну, выставачнай дзейнасці, уключаючы лазернае і галаграфічнае мастацтва, інтэрактыўныя відэаінсталяцыі, анімацыю. Гэта дае магчымасць ствараць новыя тыпы музейных экспазіцый – інтэрактыўныя, што прыцягне наведвальнікаў да больш актыўнага дыялогу. Прымяненне ў музеях новых тэхналогій дазволіць актывізаваць цікавасць да гістарычнага мінулага нашай краіны. Рэалізацыя ідэі «віртуальнага музея» з выкарыстаннем арыгінальных музейных прадметаў, гравюр, кінадакументаў дае магчымасць стварыць прынцыпова новую музейную экспазіцыю, якая не толькі забяспечвае візуальнае ўспрыманне помнікаў матэрыяльнай культуры, але і суправаджаецца адпаведнымі гукавымі эфектамі і магчымасцямі тактыльных адчуванняў. Інтэрактыўныя экспанаты даступныя для прагляду людзьмі з захворваннямі органаў зроку і слыху: замест візуальных элементаў у такой экспазіцыі выкарыстоўваюцца аўдыяэлементы, а замест слыхавых – аптычныя эфекты.

Невялікі працэнт музейных устаноў маюць уласныя інтэрнэт-сайты, але большасць раённых музеяў не маюць уласных сайтаў. Толькі найбольш буйныя музеі могуць дазволіць сабе мультымедыйныя выданні, мэтай якіх з'яўляецца папулярызацыя сваёй установы, экспазіцый і выставак. Уласная вэб-старонка ў Інтэрнэце дапаможа падтрымаць музейным установам прафесійны імідж і паўнавартасна рэкламуе на вялікую аўдыторыю паслугі музеяў. А попыт на інфармацыю аб музеях у інфармацыйнай электроннай сетцы вельмі значны.

Новай і перспектыўнай формай музейнай працы ў апошнія гады з'яўляецца культурны турызм. Тым не менш у большасці музеяў гэты кірунак яшчэ знаходзіцца на стадыі фарміравання. Музеі працягваюць заставацца эпізадычнай з'явай на фоне нарастаючай цікавасці да новых турыстычных маршрутаў і фарміравання турыстычных сетак. Недастатковая ўзаемная інфармаванасць паміж музейнай і турыстычнай галінамі, адсутнасць практыкі супрацоўніцтва – гэта тыя напрамкі работы, якія застаюцца да канца неасвоенымі. Рашэнне пытання аб уключэнні музея ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турыстычныя маршруты, ступень цікавасці, якую яны ўяўляюць для турыстычнай фірмы, залежаць і ад значымасці музея. Роля музеяў у развіцці культурнага турызму адкрывае рэальныя перспектывы: распрацоўку і ўкараненне новых метадаў работы, што дапаможа адэкватна прадставіць музейную спадчыну ўсіх рэгіёнаў.

Значным пытаннем у музейнай дзейнасці застаецца рэалізацыя паўнавартаснага музейнага патэнцыялу – больш паловы музейнага фонду застаюцца недаступнымі для шырокай масы наведвальнікаў. Прычына гэтага – не толькі ў адсутнасці экспазіцыйных плошчаў. За мяжой музеі вядуць актыўны пошук свайго месца ў разнастайнай культурнай прасторы. Музеі ператвараюцца ў важныя элементы адукацыі і навучання, паколькі менавіта яны забяспечваюць доступ да нацыянальнай культурнай спадчыны людзям рознай спецыяльнасці і ўзросту. Важкасць гэтай ролі грунтуецца на здольнасці музеяў прадастаўляць грамадскасці інтэрактыўную, прадметную і ідэйную платформы для глыбокага пазнання сваёй этнічнай ідэнтычнасці, нацыі і ўсяго свету. У музейнай сферы многіх краін актыўна праводзяцца музеялагічныя даследаванні з мэтай вызначэння вядучых напрамкаў музейнай справы ў сучасным асяроддзі, акцэнтаванне значэння метаду інтэрактыўнасці як сродку развіцця музейнай установы. Напрыклад, у Польшчы існуе праграма «Інтэрнэт для школ», з дапамогай якой музейныя экспанаты выкарыстоўваюцца ў адукацыйных і выхаваўчых мэтах.

Прыйшоў час больш паўнавартаснага змянення дзейнасці музейнай галіны з мэтай якаснага паляпшэння аховы гісторыка-культурнай спадчыны народа і яе папулярызацыі праз музеі. Паўстае неабходнасць стварэння адзінага музейнага інтэрнэт-партала Беларусі, выданне спецыялізаванага перыядычнага выдання па музейнай тэматыцы – інфармацыйнага бюлетэня, які мог бы распаўсюджвацца сярод музеяў, бібліятэк, ВНУ, профільных устаноў і да т.п.

Рэгіянальныя музеі застаюцца ў баку на арэне дзейнасці вядучых музейных устаноў і гэта перш за ўсё з-за наступных абставін, якія спрыяюць паніжэнню папулярнасці музеяў:

– адсутнасці інфраструктуры ў музеі, нездавальняючага ўзроўню камфорту;

– недахопу інфармацыі аб музейных прапановах;

– дрэннага стану інтэр’ераў і тэрыторый;

– нерэгулярнага абнаўлення экспазіцый;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– у адносінах сучаснасці – невысокага ўзроўню прапанаваных музеямі праграм.

Разам з тым нельга не адзначыць і пэўныя станоўчыя зрухі, якія адбыліся ў музейнай сферы ў апошні час. Сацыяльна-эканамічныя змены стварылі перадумовы для інавацыйных пераўтварэнняў у дзейнасці рэгіянальных музеяў, ажыццяўленне якіх патрабуе ўдасканалення сістэмы кіравання, стварэння разнастайнасці формаў і метадаў працы з наведвальнікамі. Эфектыўнае фінансавае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне рэгіянальных музеяў магчыма пры наяўнасці аналітычных цэнтраў па пытаннях музейнага маркетынгу, менеджменту, параўнальнага эканамічнага аналізу, што дасць магчымасць распрацаваць механізм прыцягнення інвестыцый для рэалізацыі музейных праграм, удасканаліць механізмы дзяржаўнай падтрымкі музейнай справы для прыцягнення дабрачыннай дапамогі, мецэнацкіх і спонсарскіх сродкаў шляхам падатковага, мытнага і іншых відаў эканамічнага рэгулявання.


1. *Лебедев, А. В.* Информационный менеджмент как технология музейной деятельности / А. В. Лебедев. – М., 2003. – 122 с.

2. *Киссель, О. М.* Современные средства отображения в пространстве музея / О. М. Киссель. – Самара, 2004. – 151 с.

3. *Пролеткин, И. В*. Интернет и Интранет как новые средства профессиональной коммуникации между музейными специалистами / И.В. Пролеткин // Информация для всех: культура и технология информационного общества : материалы Междунар. конф. EVA 2003, Москва, 1 – 5 дек. 2003 г. – М., 2003. – С. 1–13.

4. *Черкалин, С.* Завтра начинается сегодня (компьютеризированный музей, взгляд изнутри) / С. Черкалин. – СПб., 2003. – 131 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ